*Прэс-рэліз*

# Сродкі, сабраныя на анлайн-марафоне салідарнасці з беларускімі палітзняволенымі «Нам не ўсё адно!», размеркаваны ў поўным аб'ёме і ў адпаведнасці з заяўленай мэтай

Усе арганізацыі, якія сталі партнёрамі марафону, пасяхова прайшлі аўдыт Назіральнай рады марафону. Нагадаем, што раней фонд “21 мая”, які акумуляваў і размяркоўваў сабраныя на марафоне сродкі, таксама паспяхова прайшоў праверку.

**КОЛЬКІ ГРОШАЙ САБРАЎ МАРАФОН?**

563 101,99 еўра – агульная сума прыходу з картак праз Stripe і PayPal. Камісія Stripe і PayPal склала 17 161,77 еўра. Яшчэ 200 еўра з сумы былі адкліканы людзьмі, якія зрабілі данаты (такую магчымасць дае Stripe).

У выніку на рахунак фонду “21 мая” прыйшло 545 740,22 еўра, і 12 180,51 еўра прыйшло ў крыптавалюце.

Агульная сума з крыптавалютнымі сродкамі: 557 920,73 еўра.

Марафон дапамог больш чым 900 палітзняволеным.

**ЯК РАЗМЯРКОЎВАЛІ ГРОШЫ?**

Кантролем размеркавання сабраных ахвяраванняў займалася спецыяльна створаная Назіральная рада, у якую ўвайшлі прадстаўнікі медыя, арганізатары марафону.

1. Ігар Кулей, кіраўнік рэдакцыі навін «Белсат»
2. Фёдар Паўлючэнка, галоўны рэдактар «Reform.news»
3. Павел Марыніч. кіраўнік «Маланка Медыя»
4. Аляксандра Пушкіна, чалец праўлення «Zerkalo.io»
5. Вольга Сямашка, галоўная рэдактарка «Радыё Ўнэт»
6. Вольга Гарбунова, прадстаўніца па сацыяльнай палітыцы Аб'яднанага Пераходнага Кабінета
7. Кірыл Данько, экс-галоўны рэдактар тэлеграм-канала МКБ (мае дарадчы голас)
8. Віктар Малішэўскі, медыяменеджар, экс-галоўны рэдактар «KYKY.ORG»

9. Павел Свярдлоў, галоўны рэдактар «Еўрарадыё»

Назіральная рада магла бачыць усе вылічэнні, уключаючы банкаўскія камісіі і агульны рахунак.

**КОЛЬКІ СРОДКАЎ АТРЫМАЛІ ФОНДЫ?**

Праваабарончая ініцыятыва дапамогі палітвязням Dissidentby – 28 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Першы аўдыт правёў Ігар Кулей, другі – Фёдар Паўлючэнка.*

Дабрачынны фонд “Краіна для жыцця” – 60 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Павел Марыніч.*

Беларуская Рада культуры – 15 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Віктар Малішэўскі.*

Ініцыятыва BY_help – 208.271.63 EUR. Таксама ў фонд BY_help былі накіраваныя ўсе сабраныя крыптавалютныя сродкі (эквівалентныя 12 180,51 еўра).
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Павел Свярдлоў.*

Беларуская Асацыяцыя Палітвязняў “ДА ВОЛІ” – 40 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Аляксандра Пушкіна.*

Фонд дапамогі беларусам у Літве "Razam" – 28 800 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Вольга Сямашка.*

Фонд Беларускай салідарнасці BYSOL – 100 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Аляксандра Пушкіна.*

Анархічны чорны крыж - Беларусь – 40 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Вольга Сямашка.*

Дабрачынная арганізацыя Littouwin LIONS CLUB – 15 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Віктар Малішэўскі.*

Медыяпраект дапамогі беларускім палітвязням жанчынам “Палітвязынка” – 5000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Ігар Кулей.*

Фонд Медыцынскай Салідарнасці Беларусі – 5 000 EUR
*Аўдыт пройдзены. Аўдытар – Фёдар Паўлючэнка.*

З рахунку было размеркавана і адпраўлена 545 071,63 еўра, або 99,9% ад сумы, якая паступіла на рахунак фонду “21 мая”. Камісія склала 668,59 еўра, ці 0,1% ад сумы,

унесенай на рахунак фонду “21 мая”. Адпраўленыя сродкі ў крыптавалюце: 12 180,51 еўра.

**Такім чынам, агульная сума, накіраваная палітзняволеным: 557 252,14 еўра.**

**ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА МАРАФОН**

У зборы сродкаў паўдзельнічала больш за 11 000 чалавек, якія здзейснілі 14 655 ахвяраванняў.

Частым ахвяраваннем была сума ў 23.34 еўра, як напамін аб адміністрацыйным артыкуле, па якім часта затрымлівалі беларусаў.

29 ліпеня ахвяраванні прыходзілі кожныя 4 секунды, 30 ліпеня кожныя 20-30 секунд.

**Ахвяраванні былі зроблены з 86 краін свету. Топ 5 краін па суме ахвяраванняў:**

Польшча – 200 563 EUR
ЗША – 89 740 EUR
Літва – 55 130 EUR
Германія – 39 131 EUR
Вялікабрытанія – 25 790 EUR

Самы вялікі данат – 10 000 EUR (Вялікабрытанія).

**РЭАКЦЫЯ РЭЖЫМУ**

29 жніўня 2023 года суд Цэнтральнага раёна Мінска прызнаў відэазапісы марафону салідарнасці экстрэмісцкімі матэрыяламі. Адпаведныя запісы былі размешчаны ў спісе Міністэрства інфармацыі.

3 кастрычніка 2023 года сілавымі органамі была ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да арганізатараў і ўдзельнікаў прамой трансляцыі марафону. Справа ўзбуджана па ч. 2 арт. 361-2 КК Рэспублікі Беларусь (за фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці). Падазраванымі з'яўляюцца каля 60 чалавек з ліку ўдзельнікаў і арганізатараў марафону.

**ШТО ТАКОЕ АНЛАЙН-МАРАФОН САЛІДАРНАСЦІ “НАМ НЕ ЎСЁ АДНО!”?**

Гэта маштабная акцыя па зборы сродкаў для беларускіх палітзняволеных і іх сем'яў, якая працягвалася з 29 ліпеня па 30 ліпеня 2023 года.

Марафон ініцыяваны прадстаўніцай па сацыяльнай палітыцы Аб'яднанага Пераходнага Кабінета Беларусі Вольгай Гарбуновай. Яна заснавала фонд “21 мая! ("Gegužės 21") і са сваёй камандай правяла арганізацыйную працу па распрацоўцы канцэпцыі, пошуку

партнёраў і плацежных інструментаў. Фонд “21 мая” стаў адзіным кашальком, які прымаў грошы і размяркоўваў іх паміж фондамі і арганізацыямі-партнёрамі.

Партнёрамі марафона выступілі беларускія незалежныя СМІ і праваабарончыя арганізацыі. СМІ адказвалі за правядзенне марафону, праваабарончыя арганізацыі – за размеркаванне сабраных сродкаў.

**Вольга Гарбунова**: “*Мы зрабілі усё настолькі празрыста, наколькі гэта магчыма. Людзі аб’ядналіся ў салідарнасці – і гэта самае каштоўнае. Нам не ўсё адно, пакуль у Беларусі ёсць хоць адзін палітзняволены ці палітзняволеная*”.